# Ад вучня да майстра: *як жывуць студэнты-фалькларысты*

Апошнім часам інфармацыйны вір становіцца ўсё больш насычаным, таму сучаснай моладзі вельмі важна атрымаць веды, уменні, навыкі, з якімі новае пакаленне беларусаў годна будзе адчуваць сябе на зямлі продкаў, будзе шанаваць яе гісторыю, культуру, мову і ствараць будучыню краіны. У сістэме сучаснай этнамастацкай адукацыі Беларусі ёсць розныя сродкі вывучэння беларускай спадчыны, сярод якіх значнае месца, дзякуючы этнахарэолагу Міколу Козенку, займае вывучэнне традыцыйных беларускіх танцаў.

10 студзеня ў Беларускім дзяржаўным універсітэце культуры і мастацтваў у форме акадэмічнага канцэрта прайшоў паказ танцавальнай праграмы па дысцыпліне «Клас фальклорна-выканальніцкага майстэрства». На канцэрце выступалі студэнты першага курса кафедры этналогіі і фальклору. Дапамагалі ў правядзенні імпрэзы гурт «Мілавіца» і інструментальная капэла «На таку». На сцэне выконваліся фальклорныя ўзоры танцаў, адноўленыя студэнтамі па друкаваных крыніцах і відэазапісах (канец XX – пачатак XXI стст.) іх выкладчыка М. Козенкі, асобныя творы з рэпертуару рэспубліканскага конкурсу параў і салістаў-выканаўцаў беларускіх традыцыйных танцаў, які ладзіцца ў рамках фестывалю «Берагіня». Было паказана шмат танцаў з розных рэгіёнаў Беларусі: танцавальныя карагоды, сольныя і парна-гуртавыя танцы – танцы, якія паказваюць усю разнастайнасць формаў танцавальнай лексікі, кампазіцыі і манеры выканання традыцыйнай харэаграфічнай сістэмы.

Гледачы і ўдзельнікі акадэмічнага канцэрта пераканаліся, што ў адраджэнні нацыянальнай культуры і самасвядомасці ўсё больш важнае месца займае танцавальны фальклор – багацце нашых продкаў, дзякуючы якому захоўваецца імпэт, традыцыйная пластыка беларусаў і пераемнасць традыцыяў, заснаваных на агульначалавечых каштоўнасцях, ажыццяўляецца сувязь пакаленняў нашага народа, які трымаецца сваіх каранёў, сваёй гісторыі, маральных і эстэтычных ідэалаў.

***Вольга САЧЫК,***
***студэнтка кафедры этналогіі***
***і фальклору БДУКМ***

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ